г. Мінск 28 верасня 2017 г.

**ДЭКЛАРАЦЫЯ**
**Нацыянальнай кансультацыі грамадзянскай супольнасці па супрацьдзеянні мове варожасці і дыскрымінацыі ў Рэспубліцы Беларусь**

Мы, удзельнікі Нацыянальнай кансультацыі грамадзянскай супольнасці па супрацьдзеянні мове варожасці і дыскрымінацыі ў Рэспубліцы Беларусь, беручы пад увагу нацыянальныя і міжнародна-прававыя палажэнні аб недапушчальнасці дыскрымінацыі, зафіксаваныя ў Статуце ААН, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і іншых міжнародных і нацыянальных дакументах, заяўляем пра сваю прыхільнасць супрацьдзеянню мове варожасці і дыскрымінацыі, незалежна ад таго, на якую сацыяльную групу яны скіраваныя.

Мы заяўляем пра сваю гатоўнасць працягваць сумесную працу па маніторынгу мовы варожасці ў СМІ, парушэнняў правоў чалавека, дыскрымінацыі і рэагаванні на выяўленыя выпадкі.

Мы канстатуем, што мова варожасці выкарыстоўваецца ў публічнай і медыяпрасторы Рэспублікі Беларусь і з'яўляецца адным з фактараў, якія правакуюць выпадкі дыскрымінацыі ў нашай краіне. Адсутнасць комплекснага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства спрыяе праяве мовы варожасці.

Мы лічым, што Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у недастатковай меры абараняе грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, якія належаць да ўразлівых групаў насельніцтва, ад выпадкаў дыскрымінацыі і заяўляем пра мэтазгоднасць падрыхтоўкі комплекснага заканадаўчага акта пра забарону дыскрымінацыі па любых прыкметах.

Мы заклікаем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь накіраваць свае намаганні на выкараненне мовы варожасці і ўдасканаленне прававога і інфармацыйнага поля і стварэнне механізмаў практычнай рэалізацыі, якія спрыяюць зніжэнню колькасці выпадкаў дыскрымінацыі.

Мы лічым, што ўзаемадзеянне паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і пашырэнне міжведамаснага супрацоўніцтва ў сферы выкаранення мовы варожасці і процідзеяння дыскрымінацыі будзе спрыяць:
→ рэалізацыі рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ад 25 верасня 2015 года №70/1 «Пераўтварэнне нашага свету: Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года» (МУР 2030);
→ захаванню правоў чалавека;
→ забеспячэнню гендарнай роўнасці;
→ інклюзіі ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку і ў доступе да сацыяльных паслугаў;
→ павышэнню якасці жыцця грамадзянаў Рэспублікі Беларусь.

Гэтая Дэкларацыя з'яўляецца адкрытай, і мы заклікаем усе арганізацыі грамадзянскай супольнасці далучыцца да яе.